***Я. У. Паплаўскі,***
*дацэнт кафедры харавога*
*і вакальнага мастацтва*

# СУПРАСЛЬСКІ ІРМАЛАГІЁН (1598–1601) ЯК АДНА З ГАЛОЎНЫХ ВЕХ У ГІСТОРЫІ СТАНАЎЛЕННЯ РЭЛІГІЙНАЙ МУЗЫКІ НА БЕЛАРУСІ

На гістарычных картах XII–XV стст. тэрыторыя сучаснай Гродзенская вобласці пазначана нязвыклай назвай Чорная Русь. Займала яна даволі вялікі абшар паміж гарадамі Гродна, Слонімам, Ваўкавыскам, Лідай і Навагрудкам. Зараз мы называем гэтыя землі беларускімі, аднак назва Белая Русь у дачыненні да сучасных межаў краіны ўзнікла толькі ў XIX ст., а раней дастасоўвалася толькі да ўсходніх зямель – Полацкай, Тураўскай, Віцебскай, Гомельскай, Магілёўскай і нават да Смаленскай.

Княства Літоўскае з’явілася на палітычнай арэне пры княжанні Міндоўга. Сталіцай быў Навагрудак. Сам Міндоўг паходзіў з нальшанскіх князёў, а радавое гняздо яго знаходзілася пад Ашмянамі. Ён і стаў першым з вялікіх князёў, хто прыняў хрысціянства. Навогул, існуюць дзве версіі наконт яго хрышчэння. Паводле позняга Густынскага летапісу XVII ст. ён прыняў праваслаўе ў 1246 г.: «В сие же лето великий князь литовский Миндовг прия веру христианскую от Востока, со многими своими бояры, по немнозе же сын его Войшелк пострижеся во иночество». Але гэты запіс усё ж супярэчыць больш ранняму Іпацьеўскаму летапісу XIII ст., які паведамляе аб прыняцці князем у 1251 г. каталіцтва.

Адначасова з распаўсюджваннем новай веры на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага[1] з’явілася і царкоўная музыка. Хрысціянства адразу ж звярнула ўвагу на асаблівыя магчымасці музыкі як універсальнага мастацтва, таму і вызначыла для яе дамінуючае становішча ў літургіі. І хаця гістарычныя адносіны паміж усходнеславянскай культавай музыкай і заходнееўрапейскай вызначаліся рэлігійным антаганізмам Рыма і Канстанцінопаля, але і грыгарыянскі харал, і знаменны распеў, як галоўныя носьбіты гэтых культур на раннім этапе мелі тыя

[1] Вялікае Княства Літоўскае ўтварылася ў 1230–1240-я гг.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ж самыя вельмі падобныя асновы, якія іх разам аддалялі ад язычніцтва.

І тут агульнымі з'яўляліся спеў, голас, слова. У большасці гарадоў паралельна існавалі суполкі лацінскага і грэчаскага абрадаў, што прывяло да ўнікальнага ўзаемапранікнення гэтых традыцый.

Хрысціянства грэчаскага абраду прыйшло на нашы землі з Візантыі. Грэка-рымская ў сваёй аснове візантыйская культура ў працэсе станаўлення і развіцця значна ўзбагацілася элементамі этнасу іншых народаў Усходу, што надало ёй непаўторны каларыт, які так адрозніваў яе ад культуры Заходняй Еўропы. Першымі місіянерамі былі грэкі або балгары. Яны прынеслі літургічныя кнігі і з дапамогаю мясцовых спевакоў пачалі прыстасоўваць візантыйскую літургію і напевы да тутэйшых умоў. Найбольш ранні рукапісы паказваюць на блізкую сувязь паміж візантыйскімі і стараславянскімі музычнымі запісамі. Неўменная натацыя[2] ранніх форм манодыі выходзіць з тых жа візантыйскіх прататыпаў, што і знаменная. Але з часам, пад уздзеяннем народнай музыкі, яна набыла сваю асаблівасць (напрыклад, крукі[3] ў нас мелі іншае значэнне ў параўнанні з другімі краінамі, а таксама былі ўведзены знакі альтэрацыі, якія больш нідзе не сустракаліся). Па характары вельмі ўрачысты і строгі стары знаменны распеў мала-памалу пачаў ператварацца ў новы, у большай ступені заходні – кіева-літоўскі. Даўнія простыя напевы выконваліся беларускімі спевакамі ў новай рытміцы, скарочаным ці падоўжаным варыянце з інтэрваламі сексты, сепцімы, нават актавы. Суровае гучанне было заменена на больш мяккае, прасякнутае цеплынёй і жыццярадаснасцю, характэрнае ў большай ступені грыгарыянскаму харалу. Агульнай рысай гэтых двух тыпаў літургічнага аднагалосся быў прынцып слоўнага рытму, заходнія распевы на ўсім сваім першапачатковым этапе абапіраліся на вершаваныя формы з антычнымі стопамі ў адрозненне ад знаменных, літаратурную аснову якіх складала проза.

[2] Неўмы (дыханне) – знакі натацыі, якія ўжываліся ў Еўропе для запісу царкоўнай музыкі. Узніклі для абазначэння грэчаскіх моўных акцэнтаў, знакаў пунктуацыі. Неўмы нагадвалі спевакам ужо вядомыя напевы, фіксавалі агульныя контуры мелодыі.

[3] Крукі (знамёна) – знакі безлінейнай натацыі, выточнікам для якой паслужыла палеавізантыйская.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паступовае пашырэнне Рымска-каталіцкай канфесіі ў ВКЛ і адыход беларускай шляхты ад праваслаўя істотна паўплывалі на далейшае развіццё рэлігійнай музыкі. Гэта адбывалася не без удзелу цэркваў нямецкіх купцоў у Смаленску, Віцебску, Вільні, ды і Каралеўскай капліцы ў Кракаве. Асабліва заходні ўплыў адчуўся ў галіне музычнага запісу. На Беларусі і ў Заходняй Украіне знаменны нотны запіс прыйшоў у заняпад яшчэ ў канцы XV ст., а яго месца заняў лінейны з квадратнымі нотамі. У нас ён быў вядомы як кіеўскі, або квадратная натацыя, якая, верагодна, была прынесена ў ВКЛ гусітамі пасля Грунвальдскай бітвы (1410), магчыма, праз Гераніма Пражскага ці іншых прапаведнікаў. Усё ж нягледзячы на вялікі ўплыў заходняй музыкі, у Царкве ўсходняга абраду ў другой палове XVI ст. пачаўся рух за вяртанне да традыцыйнага спеву, але на іншым – больш высокім узроўні. І галоўным асяродкам, які, захоўваючы традыцыі, спрыяў развіццю і ўзбагачэнню беларускай царкоўнай музыкі, быў Дабравешчанскі манастыр у Супраслі.

Манастыры ў Беларусі пачалі ўзнікаць яшчэ ў X–XI стст. і даволі актыўна засноўваліся ў XII–XIII стст. Але вялікае значэнне як цэнтры навук і адукацыі набылі ў XVI ст. У іх сценах закладваліся асновы літаратуры, друку, тэатра і музыкі[4], стваралася сістэма адукацыі, збіраліся бясцэнныя кніжныя і рукапісныя манастырскія бібліятэкі. І безумоўна, першынство ў гэтай справе належыла вельмі багатай бібліятэцы заможнага Супрасльскага манастыра.

На працягу стагоддзяў Дабравешчанскі мужчынскі манастыр у Супраслі (зараз Беластоцкае ваяводства, Польшча) быў адным з найважнейшых беларускіх рэлігійных і культурных цэнтраў. Ён заснаваны ў 1498 г. навагрудскім ваяводам і маршалкам ВКЛ Аляксандрам Хадкевічам у радавай сядзібе ў Гарадку-на-Супраслі пры ўдзеле архіепіскапа смаленскага Іосіфа Солтана. У 1500 г. манастыр быў перанесены ва ўрочышча Сухі Груд. Першыя манахі прыйшлі з Кіеўскай лаўры. У 1501 г. была пабудавана драўляная царква Іаана Багаслова, якая згарэла ў 1650 г. Супрасльскі абраз Маці Божай, ушанаваны праваслаўнай і грэка-каталіцкай цэрквамі, быў урачыста прынесены ў дар Супрасльскаму манастыру ў 1503 г. архіепіскапам Іосі-

[4] Школы царкоўнага спеву існавалі ў Полацку ўжо ў 992 г. і Тураве ў 1005 г.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фам разам з царкоўным начыннем і богаслужэбнымі кнігамі. У імя Дабравешчання Прасвятой Багародзіцы ў 1510 г. была пабудавана царква-крэпасць. Манастыр атрымаў Статут і стаў не толькі адным з буйных цэнтраў беларускай культуры, але і цэнтрам агульнаславянскага значэння (другім пасля Кіеўскай лаўры). У ім сфарміраваліся багаслоўска-філасофская, іконаграфічная школы і своеасаблівы стыль царкоўных спеваў – супрасльскі распеў. З часоў архімандрыта Ц. В. Злобы манастыр стаў сховішчам папер роду Хадкевічаў, дзе, мабыць, знаходзіліся і дакументы пра выдавецкую дзейнасць Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца ў Заблудаве. У бібліятэцы манастыра захоўвалася вялікая колькасць каштоўных рукапісных і старадрукаваных кніг. Зберагаўся тут і найстаражытнейшы рукапіс – Супрасльскі ірмалагіён (1598–1601).

Ірмалагіён (ірмалогій, ірмалой) – збор ірмасаў[5] Царквы ўсходняга абраду, як пеўчая кніга сфарміраваўся ў X ст. у Візантыі. Уключаў у сябе ірмасы нядзельных і святочных канонаў[6], сядмічных службаў Актоіха, песнапенні на розныя святы. З візантыйскай літургічнай практыкі быў запазычаны прынцып арганізацыі музычнага матэрыялу – царкоўныя тоны, а таксама раннevізантыйскае няўменнае пісьмо, на аснове якога ў XII ст. узнікла лінейная квадратная натацыя. Каб абазначыць рытм, дынаміку і характар выканання, існавалі хейранамічныя знакі. Неабходна заўважыць, што беларускія ірмалагіёны па сваім складзе значна шырэй і ў большай ступені разнастайныя чым, напрыклад, рускія ірмалоі. Яны змяшчаюць нядзельныя стыхіры Актоіха, песнапенні святаў і штодзённага звычаю, выкладзеныя знаменным, кіеўскім, грэчаскім, балгарскім і мясцовымі распевамі.

Ёсць шмат літургічных музычных зборнікаў, перапісаных супрасльскімі манахамі. Ужо ў першым вопісе манастырскай бібліятэкі, складзенай у 1557 г. архімандрытам Сяргеем Кімбарам, зафіксаваны і музычныя рукапісы: Ермалояў[7] знаменных 4, а пяты сціхірчык; Ермалой без знамення; Кніжка, у якой Багародзіцы каноны, што спяваюцца на павячэрнях. На сёння

[5] Ірмас (спляценне, сувязь) – жанр візантыйскай гімнаграфіі.
[6] Канон уяўляе сабою цыкл з 9 песень.
[7] Пададзена паводле: «Описание рукописей Виленской публичной библиотеки» Ф. Дабранскага (Вильна, 1882).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яшчэ вядомы і наступныя беларускія ірмалагіёны: Жыровіцкі (1649), Слуцкі (1669), Давыдкаўскі (канца XVII – пачатку XVIII ст.). Але Супрасльскі ірмалагіён (1598–1601) – унікальны помнік беларускага пеўчага мастацтва. Ён налічвае 700 старонак. Быў сабраны і запісаны манахам Багданам Анісімовічам – спеваком родам з Пінска. Звесткі аб жыцці гэтага падзвіжніка невялікія. Калі лічыць, што ірмалагіён быў працаю ўжо сталага творцы, то можна меркаваць, што Анісімовіч нарадзіўся дзесьці ў сярэдзіне XVI ст. Вядома, што манаскі сан ён прыняў у Міры і толькі пасля прыйшоў у Супрасльскі манастыр, дзе і прысвяціў сваё жыццё служэнню Богу і мастацтву. Багдан Анісімовіч вылучаўся навуковым падыходам да працы. Ён заўсёды на палях пазначаў крыніцы паходжання распеваў (балгарскі, царградскі, грэчаскі, знаменны, мірскі і інш.). З асаблівай цеплынёй адносіўся да напеваў свайго Супрасльскага манастыра. Так сустракаюцца азначэнні «сей поём напелу супраслскага», або «сеже есть напелу монастыря супраслского», ці проста «М. С.». Складальнік ірмалагіёна праявіў немалыя веды і ў галіне выяўленчага аздаблення рукапісу. Яго 12 монахромных мініяцюр выкананы настолькі таленавіта, што іх можна параўнаць з найлепшымі гравюрамі Ф. Скарыны. На першай старонцы ірмалагіёна Анісімовіч выкарыстаў герб Ф. Скарыны (сонца і паўмесяц). Намаляваў выявы святых Рамана, Васіля, Давіда. Усе гравюры выкананы ў візантыйскім стылі. Як справядліва заўважыў Яўхім Карскі, ірмалагіён таксама мае і вялікую філалагічную цэннасць, так як многія каментарыі дадзены на тагачаснай беларускай мове. Выключнай акалічнасцю з'яўляецца і тое, што распевы занатаваны квадратным нотным запісам – адныя з першых ва ўсходнеславянскай літургічнай музыцы. Падсумаваўшы згаданыя некаторыя асаблівасці, можна смела сцвярджаць, што Супрасльскі ірмалагіён, складзены Багданам Анісімовічам, вылучаецца сярод другіх, якія з'явіліся ў той жа час на абшарах ВКЛ.

Да нядаўніх дзён гэты бясцэнны рукапіс захоўваўся ва Львове. Цяпер – у бібліятэцы Нацыянальнай акадэміі навук Украіны. Упершыню частка распеваў з яго была надрукавана Гаем дэ Пікардо ў 1970 г. у «The Journal of Byelorussion Studies» у Лондане.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Болтрык, М.* Хроніка супрасльскіх падзеяў / М. Болтрык // Спадчына. – 1996. – № 2. – С. 234–265.

2. *Далматов, Н.* Супрасльский Благовещенский монастырь / Н. Далматов. – СПб., 1892. – 612 с.

3. *Запартыка, Г.* Страчаныя скарбы манастырскіх бібліятэк / Г. Запартыка // Спадчына. – 1997. – № 5. – С. 40–53.

4. *Пікарда, Г.* Царкоўная музыка на Беларусі: 989–1995 / Г. Пікарда. – Мінск : НТКА «Беларуская Капэла», 1995. – 68 с.

***Б. В. Петренко,***
*кандидат технических наук, доцент,*
*доцент кафедры информационных ресурсов*

# ПРИМЕНЕНИЕ РАСПРЕДЕЛЕНИЯ В. ВЕЙБУЛЛА ДЛЯ ИНФОРМЕТРИЧЕСКОГО ИССЛЕДОВАНИЯ ИНФОРМАЦИОННЫХ ПОТОКОВ

Информационные ресурсы стали движущим фактором в науке, промышленности и управлении, а также одним из основных предметов труда. Ежегодно растет объем научной, технической и социальной информации, усложняется структура информационных потребностей как по тематике, так и по типам деятельности.

Одним из основных направлений исследований в сфере информационной деятельности является определение закономерностей: документальной информации и информационных процессов, что позволяет принимать оптимальные решения по использованию информационных ресурсов и совершенствованию процессов информационного обслуживания.

Для установления закономерностей информационной деятельности используют информетрию – дисциплину, занимающуюся изучением математических и статистических методов и моделей и их применение для количественного анализа структуры и свойств научной информации и закономерностей процессов научной коммуникации.

Исследования по информетрическому анализу информационных потоков были начаты в середине 1960-х гг. Публикации рассматривались как носители информации, журналы – как каналы связи, библиографические ссылки – как особый язык на-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ